■ Фотаздымак з гісторыяй

# САНІТАР З БРАНЯНОСЦА

У далёкім 1943 годзе майму дзядулю, Міхаілу Аляксандравічу Гічанскаму, было ўсяго 17 гадоў. Маленькую вёсачку Дзедзіна (Докшыцкі раён Віцебскай вобласці), дзе ён нарадзіўся і жыў, немцы спалілі. Многія яе жыхары схаваліся ў лесе, частку пагналі ў Германію. Тыя, хто перачакаў фашысцкае нашэсце, пайшлі ў партызаны. Вось і мой дзядуля стаў партызанам брыгады імя Леніна, якая прымала ўдзел у вызваленні Докшыц ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1944 годзе, пасля вызвалення Беларусі, яго прызвалі на службу ў армію і адправілі вучыцца ў сёмую акружную школу снайпераў, якая знаходзілася ў Слуцку. Разам з ім там набывалі ваенную прафесію яшчэ некалькі дакшычан: Васіль Рудзько з Дзедзіна, Іван Чарвінскі з Трасцяніцы, Аляксей Сясіцкі з Гняздзілава, Віктар Гойгель з Малажан, Міхаіл Яцкоўскі з Лапут. Юнакі вучыліся страляць і чакалі адпраўкі на фронт. Але ім пашчасціла — вайна скончылася.

А служба ў арміі працягвалася. Усім часцям патрабавалася папаўненне, і мой дзед трапіў у спісы салдат, якіх адпраўлялі ў Ленінград. Там яго размеркавалі ў каманду на падводную лодку. Аднак апошняя медкамісія была незадаволена станам здароўя дзядулі, і ён працягнуў службу на ваенна-марской базе Поркала-Уд (Фінляндыя), галоўнай задачай якой было прыкрыццё падступаў да Ленінграда і Кранштата.

Армейскае жыццё было складаным. Асабліва цяжка прыходзілася ў



час дзяжурства на маяку, што знаходзіўся на востраве ў адкрытым моры. Восем матросаў падтрымлівалі яго работу кругласутачна. Здаралася, што з-за дрэннага надвор'я на маяк не было магчымасці даставіць ежу, а службу трэба было несці...

Праз некаторы час Міхаіла Аляксандравіча, як аднаго з самых пісьменных і здольных матросаў, накіравалі на курсы карабельных інструктараў. Праз 6 месяцаў ён скончыў іх на выдатна па ўсіх прадметах і стаў санітарам 3 класа па 1 разрадзе. Атрымаў званне старшы матрос. Два гады служыў санінструктарам на браняносцы «Выбарг». Пасля яшчэ каля трох гадоў — санітарам у ваенным шпіталі. Толькі ў канцы 1950 года па стане здароўя ён быў камісаваны з радой ваеннаслужачых і вярнуўся ў родную Беларусь.

У Міхаіла Аляксандравіча захавалася шмат фотаздымкаў тых часоў. Амаль на ўсіх — прыгожы малады матрос, з сябрамі і акардэонам. Музыкай ён захапляўся з дзяцінства: калі ў даваенныя часы вясковая моладзь збіралася ў ка-



го-небудзь на танцы, ён хаваўся ў гэтай хаце, каб падгледзець за ігрой музыканта. А потым употай перабіраў кнопкі гармоніка, падбіраючы той ці іншы матыў. У час службы на флоце ён не толькі іграў на акардэоне, але і выпускаў сценгазету, спяваў у хоры, нават быў запявалам.

Сёлета ў дзядулі 90-гадовы юбілей. Усе родныя — трое дзяцей, васьмёра ўнукаў і чатырнаццаць праўнукаў — абавязкова збяруцца ў святочны дзень разам, каб яшчэ раз паслухаць успаміны Міхаіла Аляксандравіча і разам з ім заспяваць любімую песню былога санітара з браняносца «Прощай, любимый город. Уходим завтра в море».

**Яўгенія МАЛЕВІЧ,**
**г. Докшыцы**

***Шаноўныя чытачы! Конкурс «Фотаздымак з гісторыяй» працягваецца. Мы па-ранейшаму чакаем ад вас цікавых фота з сямейнага альбома (за выключэннем леташніх здымкаў з курорта, вясельных фотасесій і сучасных фота дзяцей). Вам ёсць што паказаць і расказаць? Давайце пагартаем сямейныя альбомы разам! Фотаздымкі (не больш за тры) з гісторыяй дасылайце з адпаведнай пазнакай на адрас: 220013, г. Мінск, вуліца Б. Хмяльніцкага, 10а або info@zviazda.by. Найлепшага аўтара чакае прыз. Арыгіналы дасланых фотаздымкаў абавязкова вяртаюцца.***

■ Кемлівым дзеткам

# МОКРАЯ НАВУКА

**Вы не можаце знайсці час, каб пазаймацца з малым? А навошта яго шукаць? Можна проста спалучаць «навуку» з пастаяннымі справамі. Так, калі купаеце малога, проста дайце яму некалькі рэчаў, падкіньце пару ідэй — заўважыце, што лепшага часу для развіцця фантазіі дзіцяці, увагі і нават матэматычных здольнасцяў не прыдумаць.**

## Алімпійскія гульні

Арганізуйце спаборніцтвы паміж цацкамі для купання. Пытайцеся ў дзіцяці, хто плыве першым, апошнім, колькі наогул удзельнікаў. Пасля заплываў пераходзім да скачкоў у ваду. Сочым, якая з цацак забярэцца вышэй: яны могуць «скакаць» як з борцікаў ванны, так і ўскараскваца (вядома, пры дапамозе дарослага) на кран альбо душ. Калі вы ствараеце падобныя гульні з гадавасікамі, выкарыстоўвайце магчымасць пазнаёміць дзіця з самымі рознымі паняццямі. Звяртайце ўвагу на колер, форму і памер цацак, іх размяшчэнне — высока, нізка, справа, глыбока. Пакажыце, што ёсць цяжкія рэчы і лёгкія. Захапіце на купанне мячыкі для настольнага тэніса. Няхай малы паспрабуе іх патапіць. А можаце прапанаваць гульню на спрытнасць — вылавіць мячыкі з вады звычайнай сталовай лыжкай. Правядзіце эксперымент з пластыкавай бутэлькай, няхай малы то набірае, то вылівае з яе ваду.

## Чакаем гасцей

Як бачыце, для вясёлага купання зусім не абавязкова мець шмат цацак — смела эксперыментуйце з рознымі рэчамі. Малым падабаецца гуляць з сапраўднымі бутэлечкамі, ёмістасцямі — з-пад шампуняў, ёгуртаў. Паспрабуйце падсунуць маленькаму геню ў час купання некалькі пластыкавых кубкаў. Няхай частку з іх ён напоўніць вадой, а пасля па вашай просьбе пакажа, колькі з іх пустых, колькі запоўнена напалову. Чаму б не паспрабаваць разабрацца, куды больш змесціцца вады: у вузкія ці шырокія кубачкі. А як набраць ваду ў бутэльку? Можаце прынесці з кухні лейку. Ці здагадаецца дзіця само, як яе выкарыстаць? Прапануйце малому прыгатаваць вячэру і запрасіць гасцей — тыя ж цацкі для купання. Можаце захапіць у ванну набор дзіцячага посуду ці сапраўдныя пластмасавыя міскі. У якасці інгрэдыентаў, акрамя вады, дзеці могуць выкарыстоўваць соль для ваннаў, хвойны экстракт (апошні, дарэчы, многія мамы раяць дабаўляць у ваду пры купанні як прафілактычны сродак пры прастудных захворваннях).

## Хованкі

Нават пенка для ванны — выдатны матэрыял для творчасці. З яе можа рабіць прычоскі і адзенне лялькам нават самы юны дызайнер. Захапіце з сабой на купанне цацачны набор цырульніка — зможаце праводзіць нават «пенныя» стрыжкі.

А яшчэ з пенай выдатна гуляць у хованкі — паспрабуйце схаваць пад ёй адшукаць розныя цацкі.

Ваша дзіця не любіць купацца? Паспрабуйце завабіць яго ў ванну на гульню, а ўсе нялюбыя прадметы пераўтварыць у чароўныя рэчы. Трэба толькі крыху фантазіі — і мыльніца стане караблікам, на якім плывуць шукальнікі скарбаў (цацкі з кіндар-сюрпрызаў). Кавалак мыла ці тая ж соль для ваннаў — чым не каштоўныя каменьчыкі? А само дзіця ў ванне можа ператварыцца ў пірата ці марскога цара, які робіць буру — варта толькі пляскаць рукамі па вадзе.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ**



■ Сямейная кухня

# БАБУЛЬЧЫНЫ ЛАНДЫШЫ

«Сёння па дарозе ў краму ўбачыла, як маці давяла да слёз дзіця сваім крыкам, школьніца агрэсіўна тузанула сабаку на павадку, — піша **мінчанка Дар'я ГУШТЫН.** — І вось іду расстроеная, думаю, што ў нас за людзі такія злыя, на самых родных і блізкіх кідаюцца. І тут зусім незнаёмы чалавек дорыць мне ландышы... Я, канешне, не хацела спачатку браць, адмаўлялася. А ён паказвае на пакет, дзе яшчэ букетаў з дзесяць, і кажа: «Я купіў у бабулькі каля крамы ўсе кветкі. Мне шкада стала, што яна на сонцы такім сядзіць. Цяпер вось раздаю».

# ЯДОМЫЯ БУКЕТЫ

А вось яшчэ адна наша чытачка, **Наталля МАЛЧАНАВА,** — не аматарка зрэзаных кветак. «Сумна назіраць, як на другі-трэці дзень яны пачынаюць «паміраць» у вазе. Таму аддаю перавагу кветкам у вазонах або арыгінальным ядомым букетам. Маёй сястры, напрыклад, будучы муж замест стандартнага вясельнага падарыў мілы букецік з памідорак чэры, які мы пасля роспісу ўсе разам з'елі.

Я таксама аднойчы атрымала арыгінальны падарунак. Каляжанка на дзень народзінаў прэзентавала мне букет, зроблены з цукерак,



Букет з цукерак.



Букет з клубніц, вінаграду і ананаса.

унутры якога я знайшла сюрпрыз — феерверк для торта. Пасля гэтага сама не раз такім чынам здзіўляла блізкіх!

Калі збіраюся, напрыклад, у госці да сяброўкі, то набываю смачныя цукеркі ў бліскучай фользе і майструю з іх букет. Вельмі простыі адначасова прывабны можна зрабіць з выкарыстаннем гафрыраванай паперы. Акрамя яе, спатрэбіцца: невялікі пластыкавы вазон для кветак, драўляныя шпажкі, пенапласт і скотч. Вазон шчыльна запоўніце пенапластам. Разрэжце паперу на невялічкія квадрацікі. Практычна цэнтр кожнага з іх шпажкай. Прымніце паперу так, каб атрымалася кветка. Яе аснову замацуйце скотчам. Лепш, калі ён будзе таго ж колеру, што і папера. На востры канец шпажкі насадзіце цукеркі, а затым уторкніце тое, што атрымалася, у вазон з пенапластам. Букет практычна гатовы! Застаецца толькі абгарнуць вазон светлай гафрыраванай паперай і перавязаць яго стужкай.

Ёсць шмат розных варыянтаў ядомых букетаў. Прынамсі я нядаўна паэксперыментавала з клубніцамі. Узяла шакалад, растапіла яго на вадзяной лазні і акунула туды садавіну. Затым паставіла застываць у халадзільнік. Узор зрабіла з белага шакаладу адмысловым кулінарным шпрыцам. Акрамя клубніц на шпажкі можна нанізаць некалькі вінаградзін. А з ананаса выразаць сардэчкі. Вось так арыгінальна мы з мужам і дзецьмі адкрылі сезон клубніц».

***Шаноўныя чытачы, праяўляйце фантазію і не стамляйцеся здзіўляць сваіх блізкіх. І, вядома ж, дзяліцеся з «Сямейнай газетай» сваімі думкамі, назіраннямі, парадамі, арыгінальнымі ідэямі. Чакаем вашых лістоў.***

ДЗЕЦЯМ ПАТРЭБНЫ НЕ ПАВУЧАННІ, А ПРЫКЛАДЫ (ЖОЗЭФ ЖУБЕР)

Адказная за выпуск Надзея ДРЫНДРОЖЫК.